Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб'яднанне па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
__________________ А.І.Жук
«___» _____________2011 г.
Рэгістрацыйны №, ТД- ___ / тып.

# МЕТОДЫКА АРГАНІЗЫЦЫІ ФАЛЬКЛОРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ: РЭЖЫСУРА СЯМЕЙНА-РОДАВЫХ АБРАДАЎ
## (Раздзел 3)

**Тыпавая вучэбная праграма**
**для вышэйшых навучальных устаноў**
**Спецыяльнасць 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках)**
**Напрамак спецыяльнасці 1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор)**

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік аддзела
навучальных устаноў
і работы з творчай моладдзю
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
______________А.У.Рыбчынская
«___»__________2011 г.

Старшыня Вучэбна-метадычнага
аб'яднання па адукацыі ў галіне
культуры і мастацтваў
______________ Б.У.Святлоў
«___» ___________2011 г.

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік упраўлення
вышэйшай і сярэдняй
спецыяльнай адукацыі
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
_____________ Ю.І.Міксюк
«___» ___________2011 г.

Рэктар дзяржаўнай
установы адукацыі
«Рэспубліканскі інстытут
вышэйшай школы»
____________ В.І.Шупляк
«___» ___________2011 г.

Эксперт-нормакантралёр
______________________
«___» ___________2011 г.

Мінск 2011

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
Пладунова Т. А., выкладчык кафедры этналогіі і фальклору Установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Кафедра этналогіі і фалькларыстыкі УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт».

Гуд П. А., загадчык кафедры рэжысуры абрадаў і святаў Установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" прафесар, кандыдат гістарычных навук.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:**

Кафедрай этналогіі і фальклору УА «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»
(пратакол № ад 2010г.);

Навукова-метадычнай радай УА «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»
(пратакол № ад « » 2010 г.);

Вучэбна-метадычным аб'яднаннем УА «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»
(пратакол № ад « » 2010 г.)

.

Адказны за выпуск: ___________________________

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма "Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці: рэжысура сямейна-родавых абрадаў" распрацавана для студэнтаў, якія атрымліваюць адукацыю па спецыяльнасці 1-18 01 01 "народная творчасць" напрамак 1-18 01 01-05 "фальклор". Дысцыпліна па "Рэжысуры сямейна-родавых абрадаў" з'яўляецца часткай вучэбнай дысцыпліны "Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці", у які таксама ўваходзяць вучэбныя курсы па "Рэжысуры каляндарных абрадаў" і "Гульнёваму фальклору".

Дысцыпліна "Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці: рэжысура сямейна-родавых абрадаў" разглядае шляхі і сродкі па засваенні і адаптацыі беларускіх сямейна-абрадавых традыцый у сучасным культурыным жыцці, выпрацаваныя айчыннымі фальклarыстамі і этнапедагогамі.

Раздзелы праграмы "Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці: рэжысура сямейна-родавых абрадаў" выяўляюць міждысцыплінарныя сувязі з курсамі "Фальклорны практыкум: сямейна-родавыя абрады", "Беларускі фальклор", "Этнафанічны практыкум: клас фальклорна-выканальніцкага майстэрства" і "Абрадазнаўчы практыкум: клас фальклорна-выканальніцкага майстэрства" спецыялізацый "Абрадазнаўства" і "Этнафоназнаўства". Ва ўзаемадзеянні ўсіх названых профільных дысцыплін спецыялізацый вучэбны дысцыпліна "Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці: рэжысура сямейна-родавых абрадаў" заклікана ажыццяўляць асноўныя палажэнні па ахове, зберажэнні і пераемнасці беларускіх сямейна-абрадавых традыцый у сучаснай сацыякультурнай прасторы[1].

Дысцыпліна "Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці: рэжысура сямейна-родавых абрадаў" аналізуе формы і метады ўкаранення сямейна-абрадавых традыцый і прымеркавных да іх рэкрыяцыйных практык беларусаў у кантэкст сучаснай мастацкай культуры ў якасці эстэтычна арганізаванай традыцыі, якія назапашаны ў XX-XXI стагоддзях і

---

[1] Закон "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь"; Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "Аб зацвярджэнні Канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны" ад 29.12.2004 г. №627.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выбудоўваюцца сёння ў рамках прафесійнай і аматарскай этнакультурнай дзейнасці. Раздзелы праграмы разглядаюць розныя падыходы творчай рэалізацыі функцыянальна-семантычнага і эстэтычнага зместу беларускай сямейнай абраднасці ў сучасным культурным жыцці, а таксама арганізацыі на іх аснове вольнага часу супольнасці.

**Мэта дысцыпліны –** узбагачэнне будучых спецыялістаў па фальклору тэарэтычнымі ведамі і практычымі навыкамі па засваенні і рэвіталізацыі сямейна-абрадавых свят і сямейна-бытавых практык шляхам іх мастацкага рэканструявання на рэгіянальнай дакументальнай аснове.

**Задачы курса:**

- фарміраванне ў студэнтаў навуковага падыходу, эстэтычных крытэрыяў і творчай матываванасці да вывучэння і ўвасаблення сямейна-абрадавых традыцый у рэчышчы іх мастацкага рэканструявання.
- авалоданне асноўнымі паняццямі і тэрміналогіяй, звязанымі з вывучэннем сямейна-абрадавых цыклаў, сямейна-бытавых практык і прымеркаваных да іх танцавальна-гульнёвых, бяседных дзей;
- раскрыццё функцыянальна-семантычнага зместу, жанравага саставу сямейна-родавых святаў і абрадаў;
- асэнсаванне працэсаў устойлівасці і пераемнасці, эвалюцыі і сучасных трансфармацый сямейна-родавых святаў беларусаў;
- выпрацоўка практычных уменняў і навыкаў арганізацыі і правядзення сямейна-абрадавых святаў і дапасаваных да іх рэкрыяцыйных дзей у сучасных умовах;
- фарміраванне аналітычнай кампетэнцыі і творчага мыслення на даследчым, сцэнарна-праектным і арганізацыйна-рэпетыцыйным этапах мастацкага ўвасаблення сямейна-родавых абрадаў і сямейна-бытавых дзей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Спецыяліст павінен ведаць:**

- асноўныя тэарэтычныя паняцці, якія разглядаюцца ў межах дысцыпліны;
- навуковыя падыходы па класіфікацыі беларускіх сямейна-родавых абрадаў і сістэматызацыі іх структурных элементаў;
- гісторыю і асноўныя накірункі даследавання сямейна-родавых традыцый беларусаў;
- агульную характарыстыку, функцыянальна-семантычны змест, жанравы састаў беларускіх сямейна-родавых абрадаў і прымеркаваных да іх пазаабрадавых практык;
- рэгіянальныя асаблівасці абрадаў сямейна-родавага цыклу і арэал іх бытавання;
- метады мастацка-практычнай фальклярыстыкі па ўвасабленні сямейна-родавых абрадаў, іншых сямейна-бытавых падзей;

**умець:**

- самастойна аналізаваць сямейна-родавыя абрады, выбудоўваць архітэктоніку дзеі паводле іх структурных элементаў (кодаў);
- складаць картатэку рэгіянальных сямейна-родавых абрадаў, падзей сямейна-бытавога характару, рэпертуарныя зборнікі фальклорных матэрыялаў;
- праектаваць сцэнарый на аснове акцыянальных кодаў абраду сямейна-родавага цыклу з улікам яго тэмпаральнага, лакатыўнага, персанальнага, атрыбутыўнага, музычна-вербальнага, музычна-інструментальнага, пластычнага кодаў;
- арганізоўваць і ўвасабляць абрадавую дзею ў рэчышчы яе мастацкага рэканстуявання;
- ажыццяўляць рэпетыцыйны працэс з гуртамі-ілюстратарамі сямейна-абрадавай дзеі і дапасаваных пазаабрадавых рэкрыяцыяных практык;
- арганізоўваць працу па якаснаму тэхнічнаму забеспячэнню мастацкай рэканструкцыі сямейна-абарадавай (сямейна-бытавой) дзеі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Усяго гадзін па дысцыпліне – 322. Аўдыторных 182, лекцыйных – 24, практычных заняткаў – 112, індывідуальных – 46.

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № п/п | Назва раздзелаў і тэм | Колькасць гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практ. | Інд. | Усяго |
| | УВОДЗІНЫ. ПРАДМЕТ І ЗАДАЧЫ КУРСА. | 2 | | | 2 |
| 1 | **Раздел 1** СЯМЕЙНА-АБРАДАВАЯ ПРАКТЫКА БЕЛАРУСАЎ І ПЕРСПЕКТЫВЫ ЯЕ ЎКАРАНЕННЯ Ў СУЧАСНЫ ЭТНАКУЛЬТУРНЫ ПРАЦЭС Сямейна-родавыя абрады і святы як арганізацыя мыслення і паводзін традыцыйнага грамадства | 2 | | | 2 |
| 2 | Этнаэкалагічны патэнцыял беларускіх сямейна-абрадавых традыцый і рэкрыяцыйна-побытавых практык | 2 | | | 2 |
| 3 | Сістэматызацыя рытуалаў радзінна-хрэсьбіннага абрадавага цыклу | 2 | 2 | 2 | 6 |
| 4 | Сістэматызацыя рытуалаў вясельнага абраду | 2 | 4 | 4 | 10 |
| 5 | Сістэматызацыя абрадавых цырымоній ушанавання продкаў | 2 | 2 | 2 | 6 |
| 6 | Сістэматызацыя пазаабрадавых практык сямейна-родавага цыклу | 2 | 2 | 2 | 6 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 7 | **Раздел 2**<br>МЕТАДЫ МАСТАЦКА-ПРАКТЫЧНАЙ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКІ ПА РЭВІТАЛІЗАЦЫІ АБРАДАЎ І СВЯТ СЯМЕЙНА-РОДАВАГА ЦЫКЛУ<br>Методыка даследавання сямейна-родавых абрадаў і свят | 2 | 2 | | 4 |
| 8 | Эстэтычныя асновы засваення сямейна-родавых абрадаў і рэкрыяцыйных практык у вучэбна-выхаваўчай і сацыякультурнай дзейнасці | 2 | 5 | | 7 |
| 9 | Мастацкае рэканструяванне сямейна-абрадавых свят і сямейна-побытавых практык на дакументальнай аснове ў аматарскай творчасці | 2 | 10 | 5 | 17 |
| 10 | Этапы мастацкага рэканструявання цырымоній сямейна-родавага цыклу на дакументальнай аснове | | 10 | 10 | 20 |
| 11 | Інавацыйныя падыходы засваення абрадавых і побытавых традыцый сямейна-родавага цыклу ў аматарскай творчасці | 2 | 5 | 5 | 12 |
| 12 | РАЗДЗЕЛ 3.<br>СЦЭНАРНА-РЭЖЫСЁРСКАЯ РАСПРАЦОЎКА АБРАДАЎ І СВЯТ СЯМЕЙНА-РОДАВАГА ЦЫКЛУ<br>Рэжысёрскі аналіз сямейна-абрадавых цырымоній і сямейна-побытавых практык | 2 | 10 | 5 | 17 |
| 13 | Сцэнарнае праектаванне цырымоній сямейна-родавага цыклу | | 30 | 6 | 36 |
| 14 | Пастановачная работа па ўвасабленні сямейна-абрадавых і сямейна-побытавых дзей | | 30 | 5 | 35 |
| | **УСЯГО** | **24** | **112** | **46** | **182** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### Уводзіны. Прадмет і задачы дысцыпліны

Сямейна-абрадавая традыцыя як адлюстраванне быцця сямейна-родавай абшчыны ва ўсіх яго праявах: у абрадах і звычаях жыццёвага цыклу, у працоўнай дзейнасці, побыце, сямейных і грамадскіх узаемаадносінах людзей, іх вераваннях, інтарэсах і душэўных перажываннях.

Уключэнне самабытных абрадавых традыцый і побытавых рэкрыяцыйных практык сямейна-родавага цыклу ў сучасны сацыякультурны кантэкст Беларусі.

Арганізацыя фальклорнай дзейнасці сродкамі мастацкага рэканструявання абрадаў, свят сямейна-родавага цыклу як сацыяльна значная практыка этнакультурнай ідэнтыфікацыі, духоўнага ўмацавання інстытута сям'і.

### Раздел 1
### СЯМЕЙНА-АБРАДАВАЯ ПРАКТЫКА БЕЛАРУСАЎ І ПЕРСПЕКТЫВЫ ЯЕ ЎКАРАНЕННЯ Ў СУЧАСНЫ ЭТНАКУЛЬТУРНЫ ПРАЦЭС

#### Тэма 1
#### Смейна-родавыя абрады і святы як арганізацыя мыслення і паводзін традыцыйнага грамадства

Сямейна-абрадавая практыка як арганізацыя мыслення і паводзін людзей паводле асноўных этапаў жыццёвага цыклу чалавека: нараджэння, уступлення ў шлюб, смерці. Адлюстраванне гэтых этапаў у трох абрадавых цыклах сямейна-родавага круга: Радзінах, Вяселлі, Пахаванні.

#### Тэма 2
#### Этнаэкалагічны патэнцыял беларускіх сямейна-абрадавых традыцый і рэкрэацыйна-побытавых практык

Абрадавыя і побытавыя традыцыі сямейна-родавага цыклу як эмацыйна збалансаваная сістэма жыццядзейнасці соцыума. Матывацыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сямейна-абрадавых і рэкрыяцыйна-побытавых практык (вячорак, ігрышчаў, гасцяванняў, вечарынак, бясед) у традыцыйнай супольнасці – забеспячэнне збалансаванасці быцця соцыума ў рытме з жыццёвымі цыкламі чалавека. Рэгулятыўная роля сямейна-родавых абрадаў і сацыяльна-побытавых практык у быцці сямейна-родавай абшчыны. Этнаэкалагічны фактар іх увядзення ў кантэкст сучаснай культуры.

## Тэма 3
## Сістэматызацыя рытуалаў радзінна-хрэсьбіннага абрадавага цыклу

Радзінна-хрэсьбінны абрадавы цыкл, яго полісастаўнасць і жанравая дыферынцыяцыя кампанентаў. Адлюстраванне ў музычна-паэтычным змесце радзінных песень асноўнага сэнсу сямейна-абрадавай цырымоніі – далучэння дзіцяці да родавай і сямейнай абшчыны.

Адлюстраванне асноўных этапаў абраду і іх эмацыйнай нагрузкі ў песнях: велічальна-віншавальных, адрасаваных нованароджанаму, яго бацькам і родным; жартоўных - да бабкі-павітухі, кума і кумы; лірыка-эпічных і , застольных, якія выконваюцца падчас абрадавай трапезы.

Абрадавая рэгламентацыя паводзін удзельнікаў і герояў урачыстасці (бацькоў, кумоў, бабкі-павітухі). Абрад падзелу “бабінай кашы” як кульмінацыйны момант радзінна-хрэсьбіннай урачыстасці, карнавальныя рысы народна-смехавой культуры ў яго імправізаваных сцэнах (пераапрананне, жарты), маральна-павучальны кампанент абраду (разнастайныя пажаданні нованароджанаму) .

Рэгіянальныя адметнасці радзінна-хрэсьбіннай абраднасці.

## Тэма 4
## Сістэматызацыя рытуалаў вясельнага абраду

Вясельны абрадавы цыкл. Развітасць комплекса вясельных абрадавых цырымоній, музычная разнастайнасць і насычанасць этнафанічнай партытуры вяселля. Драматургія вяселля, разгорнутага ў часе (на працягу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

некалькіх тыдняў) і ў прасторы (у хаце маладога, у хаце маладой). Асноўныя этапы вяселля: *перадвясельны этап* (сватанне, запоіны, заручыны, зборная субота); *уласна вяселле* (выраб каравая, пасад, прыезд дружыны жаніха па нявесту, вясельнае застолле, дзяльба каравая, ад'езд да дому маладога, сустрэча маладых, вяселле ў хаце маладога); *паслявясельны этап* (пярэзвы – узаемныя гасцяванні маладых, іх бацькоў і сваякоў). Вясельныя "чыны" і абрадавая рэгламентацыя іх паводзін.

Гістарычны генезіс і рэгіянальныя адметнасці вясельных цырымоній на Беларусі. Правядзенне вяселля па старажытным стаўбавым рытуале ( паўночна-усходняе Падзвінне); вясельнае дзейства па каравайным рытуале (пераважнае распаўсюджанне па Беларусі).

## Тэма 5
## Сістэматызацыя абрадавых цырымоній ушанавання продкаў

Абрадавыя цырымоніі ўшанавання продкаў: пахавальныя звычаі на Беларусі; паміnанне памерлых (памінкі сітуацыйныя (на 3, 9, 40 дзень пасля пахавання) і каляндарныя (Дзяды масленічныя, велікодныя, траецкія, купальскія, восеньскія, зімовыя (тры "куцці" на каляды).

Абрадавыя рэгламентацыі паводзін удзельнікаў азначаных памінальных цырымоній.

## Тэма 6
## Сістэматызацыя пазаабрадавых практык сямейна-родавага цыклу

Пазаабрадавыя практыкі рэгулявання сямейна-родавых узаемаадносін.

Творы фальклорнага дзяцінства (пацешкі, калыханкі, лічылкі, дражнілкі, гульні, каргоды) як школа маральнага, эстэтычнага выхавання, псіхафізічнага развіцця дзіцяці і як фактар уключэння яго ў соцыум.

Танцавальна-гульнёвыя ігрышчы, якія спрыялі знаёмству хлопцаў і дзяўчат. Абрадавыя і прымеркаваныя па часе і абставінах гульні нежанатай моладзі ("Яшчар", "Бахар", "Жаніцьба Цярэшкі", "Халімон", "Падушачка",

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“Удавец”, “Цяцерка”, “Баяры”, інш). Вусна-паэтычная і музычна-харэаграфічная аснова танцавальна-гульнёвых ігрышчаў. Прыпеўкі да традыцыйных танцаў: абрадавых, гульнявых, ілюстрацыйна-выяўленчых, побытавых.

Абрадавыя і прымеркаваныя па часе і абставінах бяседы, гасцяванні, вячоркі і вечарыны. Провады ў войска. Музычна-песенная аснова традыцыйнай бяседы на Беларусі. Тэматычныя групы песень, выконваемых у бяседзе: сямейна-бытавыя, любоўныя, лірычныя балады, сацыяльна-бытавыя, жартоўныя, гульнёвыя і танцавальна-прыпевачныя. Эмацыйны змест і драматургія казацка-сялянскай сацыяльнай лірыкі.

## Раздел 2
## МЕТАДЫ МАСТАЦКА-ПРАКТЫЧНАЙ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКІ ПА ЗАСВАЕННІ І РЭВІТАЛІЗАЦЫІ АБРАДАЎ І СВЯТ СЯМЕЙНА-РОДАВАГА ЦЫКЛУ

### Тэма 7
### Методыка даследавання сямейна-родавых абрадаў і свят

Архітэктоніка абрадавай дзеі сямейна-родавага цыклу як сукупнасць раўназначных па функцыянальна-семантычнай нагрузцы кодаў - тэмпаральнага, акцыянальнага, лакатыўнага, персанальнага, атрыбутыўнага, музычнага, вербальнага, пластычнага (паводле методыкі даследавання традыцыйных абрадаў расійскіх вучоных М.І. і С.М. Талстых).

Узоры класіфікацыі і сістэматызацыі сямейна-родавых абрадаў і свят, пазаабрадавых сямейна-бытавых практык айчынных фалькларыстаў А. С. Фядосіка, А.С. Емельянава, У.М.Сысова, Т.І. Кухаронак, А.І.Гурскага, Г. А Пятроўскай, Л.С.Мухарынскай, З. Я Мажэйка, і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 8
## Эстэтычныя асновы засваення сямейна-родавых абрадаў і рэкрыяцыйных практык у вучэбна-выхаваўчай і сацыякультурнай дзейнасці

Вывучэнне, засваенне і рэвіталізацыя яскравых праяў сямейна-абрадавай і побытавай культуры, па-мастацку вартасных і сацыяльна запатрабаваных і у грамадскім жыцці краіны.

Выхаваўчая роля сямейна-родавых традыцый: фарміраванне ў дзяцей і моладзі пачуццяў любові і павагі да сваіх бацькоў (свайго роду), значнасці гісторыі і культуры каранёвага этнасу Беларусі, бесперапыннасці быцця ў пакаленнях, гуманнага стаўлення да чалавека (мікракосмасу) як часткі сусвету (макракосмасу).

Рэжысура абрадаў і свят сямейна-родавага цыклу ў кантэксце захавання і рэвіталізацыі рэгіянальнай традыцыйнай культуры. Выпрацоўка механізмаў пераемнасці сямейна-абрадавага і сямейна-бытавога фальклору ў аматарскіх калектывах.

## Тэма 9
## Мастацкае рэканструяванне сямейна-абрадавых свят і сямейна-побытавых практык на дакументальнай аснове ў аматарскай творчасці

Аматарская творчасць і яе роля ў захаванні і рэвіталізацыі сямейна-абрадавых і побытавых традыцый беларусаў. Планаванне навукова-метадычнай, вучэбна-выхаваўчай і арганізацыйнай работы, сацыякультурнай дзейнасці ў аддзелах культуры і адукацыі, арганізацыйна-метадычных цэнтрах, Палацах культуры, Дамах фальклору, Цэнтрах пазашкольнай работы, музеях, аматарскіх фальклорных калектывах рэспублікі на аснове рэгіянальных сямейна-абрадавых традыцый у рэчышчы іх м астацкага рэканструяваня.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 10
## Этапы мастацкага рэканструявання цырымоній сямейна-родавага цыклу на дакументальнай аснове

*Падрыхтоўчы – даследчы этап.* Тэарэтычны аналіз сямейна-абрадавай традыцыі і яе рэгіянальных адметнасцей. Збор факталагічнага матэрыялу, пашпартызацыя фальклорных узораў. Складанне абрадавай карты сямейна-родавых цырымоній паводле сістэматызацыі іх структурных кампанентаў (кодаў). Расшыфроўка і сістэматызацыя песенных і вербальных тэкстаў абраду.

*Арганізацыйна-метадычны этап.* Афармленне падабраных фальклорных узораў у рабочы рэпертуараны зборнік альбо ў фанатэку. Складанне сцэнарыя паводле акцыянальных кодаў сямейна-родавых цырымоній і зместу прымеркаванай да іх рэкрэацыйна-забаўляльнай часткі. Рэжысёрскае вырашэнне кожнага з эпізодаў цырымоніі.

*Вучэбна-рэпетыцыйны этап.* Стварэнне фальклорнай групы выканаўцаў-ілюстратараў адпраўлення абраду, сямейна-бытавых цырымоній; засваенне ёю рэпертуару рабочага рэпертуарнага зборніка, выраб касцюмаў і святочнай атрыбутыкі, размеркаванне роляў у абрадавай дзеі, вызначэнне яе лідэраў-завадатараў і адказных па арганізацыйных пытаннях.

*Прэзентацыйны - творчы этап.* Мастацкая рэканструкцыя сямейна-родавых цырымоній з уключэннем іх ў сучасны побыт; іх стылізаванае пераасэнсванне ў форме канцэртна-ілюстратыўнага, альбо інтэрактыўнага мерапрыемстваая.

*Аналітычны этап.* Аналіз зробленай мастацка-фалькларыстычнай працы, яе дакументаванне і архівацыя, папулярызацыя ў СМІ.

## Тэма 11
## Інавацыйныя падыходы засваення абрадавых і побытавых традыцый сямейна-родавага цыклу ў аматарскай творчасці

Сучасныя свецкія абрады і святы на традыцыйнай аснове: дзіцячыя ранішнікі і этнагульнятэкі, казачныя гасцёўні, вечарынкі і гасцяванні,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

танцавальна-гульнёвыя ігрышчы і этнадыскатэкі, вяселлі, хрэсьбіны, імяніны і дні народзінаў, рытуалы прысвячэння ў салдаты і провадаў у войска, інш.

Дзяржаўныя і грамадскія этнакультурныя праекты XX-XXI ст. на аснове сямейнай абраднасці і побытавага мастацтва беларусаў: святы ў г. Мінску, г. Заслаўі,  в., Строчыцы, інш. Сучасныя формы актуалізацыі сямейна-абрадавых традыцый і побытавага мастацва (этнаграфічны і пост-фальклорны канцэрты, танцавальна-гульнёвая вечарына, музычная гасцёўня, этнадыскатэка, мастацкі перфоманс, кіналекторый этнаграфічных фільмаў, тэле-радыёпраграмы).

## РАЗДЗЕЛ 3.
## СЦЭНАРНА-РЭЖЫСЁРСКАЯ РАСПРАЦОЎКА АБРАДАЎ І СВЯТ СЯМЕЙНА-РОДАВАГА ЦЫКЛУ

### Тэма 12
### Рэжысёрскі аналіз сямейна-абрадавых цырымоній і сямейна-побытавых практык

Гісторыка-рэтраспектыўны аналіз развіцця цырымоній сямейна-родавага цыклу; іх ідэйна-тэматычны аналіз; выбудова архітэктонікі абраду як паслядоўнасці разгортвання яго функцыянальна-семантычных кодаў у прасторы і часе. Умоўна-прымеркаваныя да абраду дзеі (танцавальна-гульнёвая частка, пазаабрадавая бяседа, супольная трапеза), іх суразмернасць, лагічнасць, альбо кантраснасць.

Структура абраду ў кампазіцыйнай пабудове: пралог, экспазіцыя, завязка, развіццё дзеі, кульмінацыя, развязка, фінал. Сцэнарна-рэжысёрскі ход.

### Тэма 13
### Сцэнарнае праектаванне цырымоній сямейна-родавага цыклу

Рэжысёрскае бачанне цырымоніі сямейна-родавага цыклу: вызначэнне яе звышзадачы, скразнога дзеяння і рытуалаў-складнікаў. Сінкрэтызм вырашэння рэжысёрскай задачы, рэлізаваны ў рабоце мастака, хормайстра, музычнага кіраўніка, харэографа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўныя прынцыпы сцэнарнага праектавання мастацкай рэканструкцыі сямейна-абрадавых і побытавых практык: вызначэнне часу і месца правядзення дзеі; прасторавае рашэнне (мізансцэніраванне) яе этапаў і іх асобных фрагментаў (зоны дзеяння - пляцоўкі, апорныя і перыфірыйныя пункты); вылучэнне абрадавых рытуалаў, пазаабрадавых рэкрыяцыйных дзей у тэматычныя часткі; дэталёвае апісанне паслядоўнасці выканання пэўных дзеянняў з адпаведным песенным, вербальным, інструментальным, пластычным, атрыбутыўным суправаджэннем.

Сцэнарнае праектаванне канцэртнай праграмы, спектакля, літаратурна-музычнай кампазіцыі паводле сямейна-абрадавага і сацыяльна-побытавага фальклору.

Сцэнарны фонд сцэнічнай адаптацыі і мастацкай рэканструкцыі беларускіх абрадаў і свят сямейна-родавага цыклу (П.А. Гуд, В.Д,Ліцвінка, А.М. Аляхновіч, М.Ф. Макарцоў, І.І. Сучкоў і інш.).

**Тэма 14**

**Пастановачная работа па ўвасабленні сямейна-абрадавых і сямейна-побытавых дзей.**

Сінкрэтычны падыход па ўвасабленні дзей сямейна-родавага цыклу: ў рэчышчы мастацкага рэканструявання або канцэртна-сцэнічнай праграмы. Пастановачны кампанент укаранення іх у сучаснае грамадскае жыццё.

Паліфункцыянальнасць прафесійнай кампетэнцыі ініцыятараў рэвіталізацыі сямейна-родавых абрадаў і свят, здольнасць увасобіць сінкрэтызм усіх відаў фальклорнага мастацва ў сямейна-абрадавай ці побытавай дзеі яе драматургіі і цэльнай мастацкай партытуры.

Кананічнасць адпраўлення абраду паводле рэгіянальнага аўтэнтычнага ўзору і імправізацыя як феномен творчага самавыражэння выканаўцаў. Спецыфіка канцэртна-сцэнічнай пастановачнай работы па ўвасабленні сямейна-абрадавага і сацыяльна-побытавага фальклору.

Рэпетыцыйны працэс з выканаўцамі; вытворча-тэхнічныя пытанні па арганізацыі і правядзенні мастацкай дзеі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Літаратура

*Асноўная*


1. Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. – Мінск : БелЭн, 2005. – 2006.
2. Вяселле: Песні. У 6 кн. / АН БССР, Ин–т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Склад. Л. А. Малаш. – Кн.1–6. – Мн.: 1980–1988. (Беларуская народная творчасць).
3. Гуд, П.А. Тэхналогія стварэння свята: вучэб. дапам. / П.А. Гуд. – 2 - е выд. – Мінск : БДУКМ, 2008. – 224 с.
4. Гульні, забавы, ігрышчы / рэдкал.: А.с. Фядосік [і інш.]. – Мн.: Бел. навука, 1996. – 534 с.
5. Гурскі, А.І. Пазаабрадавая паэзія / А.І.Гурскі, Г.А. Пятроўская, Л.М. Салавей; Навук. рэд. А.С.Фядосік. - – Мн.: Бел. навука, 2002. – 564 с. – (Беларускі фальклор: Жанры, віды, паэтыка; Кн. 3).
6. Дзіцячы фальклор / Рэд. К.П. Кабашнікаў. – Мн.: Навука і тэхніка, 1972. - 654 с
7. Жаніцьба Цярэшкі / уклад. тэкстаў, уступ. арт. і камент. Л.М. Салавей. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 518 с.
8. Жартоўныя песні / АН БССР, Ін–т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; склад. І.К. Цішчанка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1974. – 728 с.
9. Камінскі, А.Я. Рэжысура традыцыйнага абраду: вучэб.-метад. дапам. / А.Я. Камінскі. – Мн.: Бел.дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009.– 112 с.
10. Ліцвінка, В.Д. Святы і абрады беларусаў /В.Д. Ліцвінка. – Мн.: Беларусь, 1997.- 176 с.: іл.
11. Народная культура Беларусі: Энцыклапедычны даведнік. - Мн.: Бел. навука, 2002. – 432 с: іл.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

12.Беларускія народныя танцы, карагоды і гульні / Уклад. В.С. Семенякоў. – Мінск: БелСЭ, 1989. –125 с.
13.Беларусы. Т 6. Грамадскія традыцыі / Рэдкал.: В.М.Бялявіна і інш. –Мн.: Бел. навука, 2002. – 606 с: іл.
14.Песні пра каханне / АН БССР, Ін–т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ім. К. Крапівы. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 378 с. – (Беларус. нар. творчасць).
15.Прыпеўкі / склад. І.К. Цішчанка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 451 с. - (Беларус. нар. творчасць).
16.Радзіны : Абрад. Песні / Нац. акад. навук Беларусі, Ін–т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы. – Мн. : Бел. навука, 1998. – 635 с. (Беларуская народная творчасць).
17.Сямейна-абрадавая паэзія. Народны тэатр / А.С.Фядосік, А.С. Емяльянаў, У.М.Сысоў, М.А.Каладзінскі; Навук. Рэд. К.П.Кабашнікаў. – Мн.: Бел. навука, 2001. – 422 с. – (Беларускі фальклор: Жанры, віды, паэтыка; Кн. 2).
18.Сямейна–бытавыя песні / [Склад. І.К.Цішчанка. – Мн. : Навука і тэхніка, 1984. – 421 с. (Беларуская народная творчасць).
19.Толстой, Н. И., Толстая, С. М. К реконструкции древнеславянской духовной культуры (лингво- и этнографический аспект)// Славянское языкознание / VIII Междунар. Съезд славистов, Загреб-Любляна, сент. 1978 г. – М.: наука, 1978. – 469 с., 1 л. карт.
20.Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6т. / Т. Б. Варфаламеева [і інш.]; склад. Т. Б. Варфаламеева. – Мн.: Бел. навука, 2004. – Т. 2. Віцебскае Падзвінне. - 910 с.
21.Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / В.І.Басько [і інш.]. – Мн.: Выш. шк., 2006. - Т. 3: Гродзенскае Панямонне. – 608 с.
22.Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т.Б. Варфаламеева [і інш.]; – Мн.: Бел. навука, 2001.- Т. 1: Магілёўскае Падняпроўе.–790 с.
РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатковая*

1. Беларускі фальклор у сучасных запісах. Брэсц. вобл. Традыцыйныя жанры. Склад. В.А.Захарава. Мн., Выд-ва БДУ, 1973.
2. Беларускі фальклор у сучасных запісах: Традыц. жанры: Гомел. вобл. /Уклад.В.А.Захарава і інш.; Уклад. муз . часткі У.І.Раговіч. – Мн.: Універсітэцкае, 1989. – 384 с.: іл., нот. іл.
3. Беларускі фальклор у сучасных запісах: Трад. Жанры: Мінск. вобл. /Уклад.В.Д.Ліцвінка; Уклад. муз . часткі Г.Р.Кутырова. – Мн.: Універсітэцкае, 1995.
4. Беларускі фальклор у школе. Дапам. для настаўніка /І.І.Сучкоў, Ф.І.Таранава, Л.У.Рута, В.В. Куржалава. – Мн.: Нар. Асвета, 1996.
5. Беларускія традыцыйныя абрады і святкаванні. Метад. рэк. для сярэдніх спец. нав. устаноў. Мн. 1991.
6. Беларускія народныя абрады / склад., навук. рэд. і прадм. Л.П. Касцюкавец. – Мн.: Беларусь, 1994.- 128 с.
7. Беларусы. Т.6. Грамадскія традыцыі / В.Ф. Бацяеў [і інш.]; рэдкал.: В.М.Бялявіна [і інш.]. – Мн.: Бел. навука, 2002. – 606 с.: іл.
8. Грамадскі быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі / В.К.Бандарчык, Л.І. Мінько, Г.І. Каспяровіч і інш. – Мн.: Навука і тэхніка, 1990. – 248 с: іл.
9. Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі / В.К.Бандарчык, Л.І.Мінько, Г.І.Каспяровіч і інш. - Мн'.: На-вука і тэхніка, 1993.- 256 с: іл.
10. Грымаць, А.А. Народная педагогіка беларусаў / А.А. Грымаць. Л.М. Варанецкая, У.В. Пашкевіч. – Мінск: Ул.М.Скакун, 1999. – 256 с.
11. Дзіцячы фальклор: зборнік фальклорных матэрыялаў / рэдкалегія: У.А. Васілевіч і інш. – Мінск: БДПУ, 2006. – 359 с.
12. Сацыяльна-педагагічны патэнцыял беларускіх свят і абрадаў: вучэб-метад. Дапам. / аўт.-склад. Т.І. Кухаронак, в.Г. Кухаронак. – Мн.: БДПУ, 2005. – 108 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## КІНА- , ВІДЭАГРАФІЯ

1. Голоса веков / Сцен. З. Можейко. - Белорусьфильм, ВА “Летапіс”, 1979.
2. Память столетий / Сцен. З. Можейко. - Белорусьфильм, ВА “Летапіс”, 1982.
3. Пранясі, Божа, хмару / Сцэн. З. Можейко. - Беларусьфільм, ВА “Летапіс”, 1990.
4. Рух зямлі / Сцэн. З. Можейко. - Беларусьфільм, ВА “Летапіс”, 1999.
5. Мужчынскі рой / Сцэн. Г. Тавлай, рэж. С. Гайдук - РУП “Белвідыёцэнтр”, 1995.
6. Мотальскія байкі / Сцэн. і рэж. В. Пястоў - РУП “Белвідыёцэнтр”, 1990.
7. Карагод / Сцэн. Н. Козенка, рэж. і апер. О. Шклярэўскі - РУП “Белвідыёцэнтр”, 1995.
8. Беларускае адзенне / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. А. Дыбча - ТА “Радавод” Белтэлерадыёкампаніі, 1998.
9. Былічкі / сцэн. Р. Гамзовіч - ТА “Радавод” Белтэлерадыёкампаніі, 1996.
10. Вяселле ў Моталі. Абрад “свахі” / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. М. Зарэмба - ТА “Радавод” Белтэлерадыёкампаніі, 1998.
11. Жураўка / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. А. Дыбча - ТА “Радавод” Белтэлерадыёкампаніі, 1999.
12. Культ продкаў / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. А. Дыбча - ТА “Радавод” Белтэлерадыёкампаніі, 1997.
13. Культ продкаў / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. А. Дыбча - ТА “Радавод” Белтэлерадыёкампаніі, 1998.
14. Стравы на Дзяды / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. А. Дыбча - ТА “Радавод” Белтэлерадыёкампаніі, 1998.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ